**ДУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**

**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі**

**Інфармацыйна-бібліяграфічны сектар**

# *КАЛОДЗІЧ КАНСТАНЦІН КАНСТАНЦІНАВІЧ*



## *(ДА 65-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)*

## ШОРТ-ЛІСТ

Пінск, 2018

Канстанцін Канстанцінавіч Калодзіч нарадзіўся 12 красавіка 1953 года ў Пінску.

1968 – 1970 гг. — наведваў студыю Дома піянераў у г. Пінску.

З 1969 па 1971 гг. — вучыўся ва Усесаюзным завочным народным універсітэце імя Н. К. Крупскай у Маскве.

Скончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (архітэктурны факультэт, 1975). Вучыўся ў М. Чурабы, М. Бялова, М. Пракаповіча.

Працаваў выкладчыкам ў дзіцячай мастацкай школе г. Брэста, педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна, загадваў аддзелам абласнога навукова-метадычнага цэнтра ўпраўлення культуры аблвыканкама.

Канстанцін Канстанцінавіч выкладаў ў Брэсцкім політэхнічным інстытуце (Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце). З 1996 па 2005 гг. – дацэнт кафедры архітэктурнага праектавання і малюнка.

Удзельнік мастацкіх выстаў з 1977 года.

Член Беларусскага саюза мастакоў з 1995 года.

Працуе ў жанры пейзажа і нацюрморта, не цураецца партрэта. Асноўнымі матэрыяламі ў творчым працэсе з'яўляюцца папера і пастэль.

Мастак больш схільны да роднага пейзажа з яго зменлівасцю, межавымі станамі, лірыка-філасофскімі абагульненнямі. Яго пастэльныя аркушы перадаюць багацце ўзаемапранікнення фарбаў падобна да таго, як гэта адбываецца ў прыродзе.

Асноўныя творы: кампазіцыя "Ноч. Вясна", "Калядныя маразы", "Успаміны пра Гагена", "Сланечнікі", "Рэквіем", "Бягоніі", "Моцарт. 38 сімфонія", "Бах. Арганная меса", "Рабіна", "Рыба"; трыпціх "Чорнае сонца Восіпа Мандэльштама" і інш.

Творы Канстанціна Калодзіча вылучаюцца вялікай мяккасцю, пяшчотнасцю колераў. Захапленне прыродай дазваляе яму глыбей зазірнуць сабе ў душу, у душу блізкіх людзей.

У 1990-я гады Канстанцін Калодзіч разам з жонкай Раісай пасяліліся ў г. Жабінцы, дзе набылі невялікі дом, каб бліжэй быць да прыроды. Абодва заўзятыя аматары кніг, сабралі вялікую дамашнюю бібліятэку мастацкай літаратуры, шыкоўную фанатэку.

У 2006 годзе ён выставіў свае работы ў цэнтральным Доме мастакоў у Маскве, адна з галерэй "LES OREADES" набыла іх.

Па бацькоўскай дарозе пайшлі дзеці: дачка Алена працуе мастацтвазнаўцам-культуролагам, а сын Фёдар скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага ўніверсітэта імя П. Машэрава.

## Працы К. К. Калодзіча


1. Пастель: Пастельная живопись, пастель и рисунок пастелью в учебном процессе студентов архитектурной специальности : методические указания / БрПИ ; сост. К. К. Колодич. — Брест, 1997. — 15 с.


## Аб жыцці і творчасці мастака


2. Калодзіч Канстанцін Канстанцінавіч : [“Бягоніі”] // Беларускі саюз мастакоў. 1938—1998 : энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1998. — С. 239.
3. Канстанцін Калодзіч = Konstantin Kolodich : [“Памяці Фёдара Скачкова”] // Мастакі Брэстчыны : альбом-каталог / аўт.-склад. Кузьміч М. П. — Брэст : Брэсцкая друкарня, 2010. — С. 64—65.
4. Константин Колодич : [“Ветка клёна”] // Художники Брестчины : альбом-каталог. — Минск : А. Климов, 2002. — С. 60—61.
5. Константин Колодич = Konstantin Kolodich : [“Я дед… мне сорок лет”, пастель] // Художники Брестчины : альбом-каталог. — Минск : Хелмон, 1997. — С. 44—45.
6. Валасюк, Л. Мастак лірычнага пейзажа : [Калодзіч Канстанцін Канстанцінавіч] / Л. Валасюк // Непрыдуманыя партрэты : мастакі і літаратары, народныя майстры і дойліды Берасцейшчыны / Лявон Валасюк. — Брэст : Брэсцкая друкарня, 2014. — С. 48—51.
7. Колодич Константин Константинович // Брестская областная организация ОО «Белорусский союз художников» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://art.brest.by/колодич-константин-константинович . — Дата доступа: 03.04.2018.



*Выканаўца:*
*Гарачова А. Н., гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі*


Красавік 2018 г.